**27 верасня 2020 г. – 65 гадоў з дня нараджэння Марыя Іванаўна Ляшук (1955), журналіста, пісьменніцы, лаўрэата прэміі Беларускага саюза жанчын**



Марыя Іванаўна Ляшук нарадзілася 27 верасня 1955 г. у вёсцы Табулкі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і калгаснікаў. З дзяцінства цягнулася да літаратуры. Калі вучылася ў чацвёртым класе, яе верш надрукавала газета «Піянер Беларусі». У 1973 г. скончыла Табульскую сярэднюю школу і паступіла на факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна.

Завяршыўшы навучанне ў 1978 г., Марыя Ляшук вярнулася ў Пінск і стала працаваць карэспандэнтам, а потым рэдактарам мясцовага радыё ў трыкатажным аб'яднанні «Палессе». У 1990 г. перайшла працаваць карэспандэнтам гарадской газеты «Пінскі веснік». Праз некаторы час была назначана загадчыцай аддзела пісьмаў, потым – намеснікам рэдактара, а з 1996 г. па 2012 г. – рэдактарам гэтага выдання. З лістапада 2012 г. працавала памочнікам дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. І. Палейчука і карэспандэнтам газеты «Пінскі веснік», затым – уласным карэспандэнтам абласной газеты «Народная трыбуна».

Марыя Ляшук добра вядома на Брэстчыне як таленавіты паэт-лірык і як аўтар цудоўных «жаночых» апавяданняў. Піша на беларускай і рускай мовах. Друкавалася ў часопісах «Гаспадыня», «Алеся», «Нёман», альманаху «Гоман», у рэспубліканскіх газетах – «7 дней», «Будем здоровы!», «Рэспубліка», «Народная газета», «Літаратура і мастацтва», абласных – «Заря», «Народная трыбуна».

У маі 2007 г. выйшаў зборнік навел і вершаў М. І. Ляшук «Благословённые небом». Значную частку зборніка складаюць непрыдуманыя гісторыі – навелы, нарысы, лірычныя замалёўкі ў прозе. У цэнтры ўвагі – лёс чалавека, галоўным чынам жанчыны. Лёсы гераінь кнігі асаблівыя, часцей падкрэслена трагічныя. На першым плане ў навелах маральна-этычныя праблемы, складаныя варункі чалавечых узаемаадносін, паводзіны чалавека, які ўцягнуты ў цяжка вырашальны маральны канфлікт. Другая частка кнігі – паэтычная, у якой аўтар развівае сваю гуманістычную пазіцыю.

Марыя Іванаўна была галоўным рэдактарам літаратурна-мастацкага зборніка «Піншчына літаратурная» (1999), выступіла ўкладальнікам зборнікаў паэзіі: «Струменя» серебряные струны» (2008), «Кружева полесских зарниц» (2011), «Созвездие любви» (2013).

Марыя Ляшук з'яўляецца членам Беларускага саюза журналістаў, з кастрычніка 2006 г. – членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, уваходзіць у праўленне Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ. З сакавіка 2006 г. – кіраўнік клуба літаратараў Піншчыны «Пінчукі», які дзейнічае пры Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц.

Лаўрэат прэміі Беларускага рэспубліканскага саюза жанчын за цыкл навел аб жаночых лёсах. Узнагароджана дыпломам і значком Беларускага саюза журналістаў за лепшую журналісцкую работу і рэспубліканскім творчым конкурсе «Залатое пяро», нагрудным знакам «Выдатнік друку». Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2020 г. Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Я. Янішчыц. Анцімонік Кацярына Міхайлаўна, гал. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Творы М. І. Ляшук**

1. **Благословенные Небом** : проза, поэзия / Мария Ляшук ; [прадмова В. Локун]. – Пинск : Пинская региональная типография, 2007. – 301 с.
2. **Кружева полесских зарниц** : сборник стихов и прозы / литературное объединение «Струмень» ; сост. М. И. Ляшук. – Брест : Альтернатива, 2011. – 248 с.
3. **«Струменя» серебряные струны** : стихи и проза : [творчество членов пинского литературного объединения «Струмень»] / сост. М. И. Ляшук. – Брест : Альтернатива, 2008. – 206 с.
4. **Лазіцкая, Г. І.** Прайсці поруч : вершы, паэма, апавяданні / Галіна Лазіцкая ; [прадмова М. І. Ляшук]. – Брэст : ААТ «Брэсцкая друкарня», 2019. – 180 с.
5. **Корогвич, И. М.** Ритмы жизни : стихи / Иван Корогвич ; [предисловие М. Ляшук]. – Пинск : Пинская региональная типография, 2016. – 152 с.
6. **З любоўю да малой радзімы** : [верш] / Марыя Ляшук // ЛіМ. 2020. 17 красавіка (№ 15). С. 13.
7. **Дзядулі** : [верш] / Марыя Ляшук // Заря. 2019. 20 июля. С. 16.
8. **Сустрэча** : [верш] / Марыя Ляшук // Полесская правда. Пинск, 2019. 29 июня. С. 10.
9. **Живи, любовь, живи!** : стихотворения / Мария Ляшук // Гаспадыня. 2019. № 1. С. 41.
10. **Палессе** : [верш] / Марыя Ляшук // Полесская правда, Пинск. 2018. 1 сентября. С. 4.
11. **Дожджык** ; Боты ; Любовь и удача ; Чаму баліць? ; «Закрываю глаза и вижу...» ; «Всё реже в зеркало смотрю...» ; Вясна чараўніца : [вершы] / Мария Ляшук // Гаспадыня. 2018. № 8. С. 41.
12. **Дзверы ў мінулае** : [апавяданне] / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 7 жніўня (№ 32). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
13. **Заплаканыя зоркі** : [апавяданне] / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 29 мая (№ 22). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
14. **Грэшнае шчасце** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 15 мая (№ 20). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
15. **Каханне на... чацвярых** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 27 сакавіка (№ 13). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).

16. **Напаўзабытыя акорды** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 6 сакавіка (№ 10). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
17. **Згублены пярсцёнак** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 23 студзеня (№ 4). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
18. **Грэхападзенне** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2015. 16 студзеня (№ 3). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
19. **Цяпло вечнай мерзлаты** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2014. 12 верасня (№ 37). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
20. **Услед за марай** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2014. 15 жніўня (№ 33). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
21. **Грехопадение** / Мария Ляшук // Гаспадыня. 2014. № 6. С. 43. (Непридуманные истории).
22. **Блакітная кроў** / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2014. 28 сакавіка (№ 13). С. 12. (Непрыдуманыя гісторыі).
23. **Зіма на дваіх** ; Вішнёвая завея ; Смутак блакітных незабудак : навелы / Марыя Ляшук // Маладосць. 2013. № 10. С. 25–29.
24. **До боли, до последнего вздоха** : [о своей малой родине – деревне Тобулки] / Мария Ляшук // Гаспадыня. 2009. № 3. С. 2.
25. **Золотая осень, золотая!** : [стихотворение] / Мария Ляшук // Братина. 2008. № 12. С. 129.
26. **Палессе** ; «Жаўтавокія рамонкі падары…» ; «Яшчэ дзянёк – і пырснуць лісцем…» ; «А ён не бачыў – йшла мая вясна…» : [вершы] / Мария Ляшук // ЛіМ. 2006. 24 сакавіка. С. 8
27. **И лечит время горестные раны** : [стихи] / Мария Ляшук // Нёман. 2006. № 5. С. 111–113.
28. **«Звенящий лист кружился в вышине…»** ; «И вновь холодная луна...» ; «Все не так, как хотелось…» ; «Прости, любовь, ты нас зови…» : [стихи] ; Запоздалый крик журавлей : [рассказ] / Марыя Ляшук // Гоман : усебеларускі літ.-маст. альманах. Мінск. 2006. Вып. 1. С. 10–11 ; 127.
29. **«Ах, лістападзе-лістапад…»** ; «Бачыш – ноч сыпнула зерне…» ; «І мо таму, што кожную хвіліну…» ; «І зноў я тут, у роднай хаце…» ; Маме ; «А ён не бачыў, як ішла мая вясна...» : [вершы] / Мария Ляшук // Маладосць. 2006. № 11. С. 41–42.
30. **Непридуманные истории** / Мария Ляшук // Нёман. 2007. № 8. С. 61–69 ; 2005. № 9. С. 136–143 ; 2004. № 12. С. 62–64.

## Аб жыцці і творчасці М. І. Ляшук

1. **Ляшук Марыя Іванаўна** // Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : бібябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнрікаў Беларусі. Брэст : Альтернатива, 2018. С. 123–125.
2. **Марыя Ляшук** // Літаратурная карта Берасцейшчыны / рэд. і укл. А. Крэйдзіч. Брэст : ААТ «Брэсцкая друкарня», 2008. С. 491–493.

3. **Марыя Іванаўна Ляшук** // Святло палескіх зорак (жаночая паэзія Піншчыны). Пінск : Аддзел абслугоўвання і інфармацыі Пінскай РЦБС, 2011. С. 15–16.
4. **Локун, В. И.** Современная проза писателей г. Пинска : [Ю. Солоневича, М. Ляшук, Н. Еленевского, В. Гришковца] / В. И. Локун // Социально-экономическое и историко-культурное развитие Полесского региона в XXI веке. Пинск, 2006. С. 206–208.
5. **Уладзімірава, Г.** «Палявая кветка на табульскім прыволлі» : [пра творчы вечар, прысвечаны 60-годдзю М. І. Ляшук, у Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц] / Ганна Уладзімірава // Полесская правда. Пинск, 2015. 10 октября. С. 9.
6. **Міхалевіч, Г.** З-пад залатога пяра Марыі Ляшук нараджаюцца нарысы і апавяданні, якія не пакідаюць абыякавымі шматлікіх чытачоў / Галіна Міхалевіч // Народная трыбуна. 2014. 23 мая (№ 21). С. 1.
7. **Тачкар, В.** Сяброўцы : [верш, прысвечаны М. Ляшук] / Вера Тачкар // Полесская правда, Пинск. 2013. 28 сентября. С. 3.
8. **Бацькоўскі скарб годна нясуць па жыцці** : [пра М. Ляшук] // Алеся. 2011. № 3. С. 48.
9. **Борисевич, В.** Благословенные Небом : [о книге М. Ляшук] / Валентин Борисевич // Нёман. 2008. № 2. С. 163.
10. **Бельскі, А.** Неадлучная ад традыцыі : паэзія часопіса «Маладосць» за 2006 год : [з тэксту: Марыя Ляшук] / А. Бельскі // Полымя. 2007. № 10. С. 165.
11. **Побединская, С.** Истории, благословенные Небом : [презентация первой книги М. Ляшук] / Светлана Побединская // Народная газета. 2007. 14 ліпеня. С. 12.
12. **Побединская, С.** Истории, благословенные Небом / Светлана Побединская // Пінскі веснік. 2007. 15 чэрвеня.
13. **Кантор, Д.** «Благословенныя Небом» : [о книге М. Ляшук] / Дмитрий Кантор // Заря. 2007. 12 мая. С. 17.
14. **Кантор, Д.** Портрет на фоне времени : [о книге М. Ляшук «Благословенныя Небом»] / Дмитрий Кантор // Пінскі веснік. 2007. 13 красавіка.
15. **Прынятыя ў Саюз пісьменнікаў Беларусі** : [М. Ляшук] // ЛіМ. 2006. 3 лістапада (№ 44). С. 3.
16. **Редактор – член Союза писателей Беларуси** : [М. Ляшук] // Пінскі веснік. 2006. 13 кастрычніка.
17. **Побединская, С.** Приз редактору : [М. Ляшук завоевала приз за лучшее освещение темы материнства] / Светлана Побединская // Пінскі веснік. 2006. 7 сакавіка.
18. **Локун, В.** Предисловие к «Непридуманным историям» Марии Ляшук / Валентина Локун // Нёман. 2004. № 12. С. 62.

Пінскі раён

Табулкі
Пінск
Ляшук Марыя Іванаўна
Журналісты
Пісьменнікі
Паэты